первозданные лесные инстинкты, недремлющие языческие представления о мире. Взрывоопасная смесь Азии с Европой, язычества с христианством, французского с нижегородским, искусственного с природным…» [1].

Вот что говорит о своём спектакле режиссер-постановщик Римас Туминас: «Я подумал, что с Татьяной я когда-то в жизни поступил так же, как и Онегин. И теперь моя жизнь – это тоска эмиграции. Татьяны – это девушки, это красота, дарённая нам, которую мы не умеем любить и хранить. И спектакль, в первую очередь, о том, как мы убиваем в себе эту красоту, не умея любить и ценить то, что нам дано свыше. Изначально, когда у меня возникли картинки спектакля, я видел «балетный класс», Пушкинскую скамейку и кибитку – это декабристы, Сибирь, это изгнание и аресты и это целая эпоха. И это напоминает вечную вину, бег по замкнутому кругу»[1].

СПИСОК ИСПОЛЬЗОВАННЫХ ИСТОЧНИКОВ:

1. Евгений Онегин. Театр им. Вахтангова. Пресса о спектакле. – [Электронный ресурс]. – Режим доступа: http://www.smotr.ru/2012/2012-_vah_onegin.htm. – Дата доступа: 23. 02. 2020.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Азаров Д. М., БГУКИ, студент 118 группы
очной формы обучения
Научный руководитель – Новик В. Н.,
доцент кафедры

## САКРАЛЬНЫЯ ВОБРАЗЫ ПАРТЫЗАНСКАЙ ТЭМАТЫКІ Ў ПЕСЕННА-ХАРАВОЙ ТВОРЧАСЦІ БЕЛАРУСКІХ КАМПАЗІТАРАЎ

Ад пачатку Вялікай Айчыннай вайны на Беларусі узнікае магутны партызанскі рух як народны супраціў фашысцкай акупацыі. Аднак не толькі баявымі дзеяннямі адзначалася «партызанка», але і стварэннем

партызанскага мастацтва, своеасаблівай ідэалагічнай зброі ў падтрымку партызан і тых, хто знаходзіўся на акупіраванай тэрыторыі. З 1942 года ствараюцца агітацыйна-мастацкія брыгады на Міншчыне, Віцебшчыне, ў 1943 годзе ў Лідскім раёне, а з 1944 года утвараецца агітацыйна-мастацкі атрад імя Горкага, які пасля вызвалення стаў прафесійным Маладзечанскім абласным ансамблем песні і танца. Фалькларысты сабралі і запісалі шмат песень вядомых мамадзейных і беззыменных аўтараў, многія з якіх гэта «песні-пераробкі», калі да вядомых мелодый пісаліся новыя тэксты, альбо перарабляліся мелодыі да напісаных аўтарамі песень. Пра многіх аўтараў, якія сваім песнямі будзілі ўспаміны аб мірным жыцці і ўзмацнялі веру ў перамогу, піша Л.С. Мухарынская ў кнізе «Беларуская народная партызанская песня» (Мн.1968).

Хвалюючая партызанская тэма непасрэдна ўвасобленна і ў творчасці беларускіх кампазітараў. Толькі ў перыяд ваеннага часу былі створаны гераічныя масавыя песні: «Клятва партызан» Я. Цікоцкага, «Партызан Р Пуксты, «Праз лясы, балоты і паляны» М. Аладава. Лірыка-патрыятычныя песні – Цыкл партызанскіх песень П Падкавырава; «Беларускім партызанам» (сл. Янкі Купалы), «Песня Мінаеуцау»(сл. А. Астрэйкі) Р.Пуксты і іншыя. Карцінамі беларускай прыроды навеяна песня Р.Пуксты «Ой, лясы мае, паляны»(сл. А. Астрэйкі). У 1944 годзе гэтая партызанская песня была ўключана ў рэпертуар палескага хору, якім на той час кіравай Г.І. Цітовіч, а ў 1949 годзе ў Дзень Перамогі яна зноў загучала ў выкананні трохтысячнага зводнага хору на свяце песні ў Баранавічах. У тым жа 1944 годзе на вызваленне Беларусі, былі створанны фактурна звар‘іраванны хор «Будзем сеяць, беларусы» С. Палонскага (сл. П. Броўкі) і гімнічна-аккордавага складу хор «Шуміць наша слава» А.Багатырова (сл. П.Броўукі).

Пераважная большасць песнь і хораў прысвечанных партызанскай тэме цесна звязаны з вобразамі лесу, бору, пушчы, асобных дрэў (дуб, бяроза, сасна, таполя). Беларусь даваеннага часу была пакрыта густымі лясамі, суцэльнымі балотамі, пералескамі, у гэтых і іншых недаступных мясцінах і

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

базіравалася партызанскія брыгады і атрады, а насельніцтва знаходзіла там прытулак пад час аблаў карнікаў. Адна з самых лепшых, пранікнёных і вядомых сёння песень аб партызанах, так і называецца «Лясная песня». Яе стварыў кампазітар-франтавік Ул.Алоўнікаў на словы Адама Русака. Бярозы і сосны з гэтай песні названы партызанскімі сёстрамі. Якія ніколі не забудуць тыя, хто жыў і змагаўўся побач з імі. Кампазітарам напісаны і іншыя творы прысвечаныя партызанскай тэме: «Партызаны ідуць»(сл. М. Шарамета), «Песня пра Заслонава» (сл. А. Астрэйкі) і іншыя. Вядомая ў гэтай тэме яго сімфанічная паэма «Партызанская быль», а таксама велічна-эпічны змешаны хор a capella «Партызанскія акопы»(на сл. М Танка). Адзначаецца хор вакалізам-акордавым уступам, які перадае інтанацыі плачу, галашэння за ім ідзе гераічны ўступ мужчынскіх галасоў. Лірычныя «прасветлёныя» эпізоды сярэдняй часткі даручаны жаночым галасам. А эпізод характэрызуючы былых партызан, будуецца на валявой маршавай тэме, блізкі да салдацкіх песен. Кульмінацыя хору знаходзіцца у рэпрызе, дзее аб‘ядноўваецца тэмбры жаночых і мужчынскіх галасоў. Пры гэтым высокія галасы (S,T) развіваюць ў імітацыі асноўную тэму, а нізкія (A,B) адыгрываюць ролю фону. Аднаіменны змешаны a capella хор Р.Пукста напісаны ў рыпрызнай трохчастковай форме. Крайнія раздзелы выкладзены ў гамафонна-гарманічнай фактуры і па характару нагадваюць жаласнае шэсце, сярэдні лірычны песенны эпізод у жаночых галасоў, змяняецца сурова-гераічным гучаннем «а былыя партызаны...», развіваючыся у харавое фугата. Рэпрыза амаль цалкам паўтарае першую частку. У беларускай харавой музыцы гэтыя творы лічацца па праву лепшымі, «класічнымі» у адлюстраванні партызанскай тэматыкі.

Гераічная тэма барацьбы шырока трактуецца праз вобраз дуба – сімвала волі, мужнасці і трываласці духа беларускага народа, які выстаяў у вяках. Гэта велічна-эпічныя хоры і рамансы М. Аладова «Дуб» (сл. А. Дзерушынскага), Ул. Алоўнікава «Дуб» (сл. М. Танка), Р. Пуксtarg «Дуб» (сл. П. Броўкі), Г. Вагнера «Дуб» (сл. Е. Лось). Блізкі па тэматыцы да гэтых хораў «Пушчы-бары» М. Аладова (сл. М. Клімковіча), напісаны у санатнай

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

форме. На тэму пушчы вядомы і хор Ю. Семенякі «А Пушча гамоніць» (сл. Э. Валеевіча). Сімвалічная ў гэтым хоры другая палова першай страфы, якая паўтараецца « і пушча гамоніць то сумна, то грозна, дубы векавыя не спяць...». У канцы хора, асілкі-дубы перадаюць сваю песню («Аб слаўных сынах-беларускіх героях») маладым дубкам. Хор пабудованы ў трохчастковай форме, дзе крайнія часткі гамафонна гарманічныя, аднак з элементамі імітацыі падгалоскаў, а сярэдняя кантрастная метрыкай (4/4) і маршавым тэмпам, дзе мужчынскія галасы ў чатырохгалоссе, з паўзіраваннем на восьмых, рытмічна кантрапунктуюць напеўнасці ўнісонна-гетэрафоннай тэме жаночых галасоў (S,A).

Па-новаму да раскрыцця партызанскай тэмы ў пачатку 70-ых гадоў падыйшлі кампазітары Э. Тырманд, Д. Смольскі і К. Цесакоў. У трыпціху Э. Тырманд на сл. М. Танка намаляваны пейзаж, які падаецца ў спалучэнні з грамадскай тэмай. Першы хор «Каб ведалі», светлы, эпічны вобраз сасны пададзены як памяць, своеасаблівы абеліск над магілай герояў. Другі хор «Сасна» кантрасны да першага сваей трагедыйнасцю. Сасна выступае як успаміны, бо асацыіруецца з шыбеніцай для партызан і выклікае праклёны . У хоры выкарыстаны складаныя метры( 8/4, 10/4, 13/8); кампазітар прымяняе рэчытацыю и дэкламацыйнасць для стварэння змрочных, абвострана-экспрэсійных вобразаў. Харавая фактура паліфанізаваная, кантрастам уводзіцца вобраз ворана, як сімвала смерці. Харавы трыпціх Д. Смольскага на сл. М. Танка, складаюць тры хары: «Ля гэтых сосен», «Плача хмара без жалю» і «Я хацеў бы каб песню маю». Кожны з хораў адлюстроўвае розныя бакі тэмы – гэта роздум аб гераічным мінулым, замалёўкі сцэны развітання дзяўчыны з маладым партызанам , трэці – споведзь героя, апавяданне аб загінуўшых сябрах. Харавы трыпціх К.Цесакова напісаны на сл. А. Ставера і В. Лукшы. Першы хор «Смерць партызана» – малюе карціну смерці старога партызана, другі – «Дзявочая клятва», трэці – «Ненапвіджу» – носіць абагульняны, філасофскі характар.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Хор-успамін Ю. Семянякі «Вы чулі, як плачуць дрэвы»(сл. П. Броўкі), сваеасаблівы рэквіем па тых, хто не вярнуўся з вайны. Як імітацыя шуму дрэў, гучыць трохгалосны вакаліз спачатку жаночых, а затым мужчынскіх галасоў, падрыхтоўваючы уступ тэме сапрана песеннага характару. У далейшым кампазітар выкарыстоўвае імітацыйныя пераклічкі галасоў, паступова памяншаючы дыяпазон і дынаміку. Гэта звязка падводзіць да харавога рэквіему на словах «вы чулі, як плачуць дрэвы па тых, хто дамоў не прыйшоў». Драматычныя кульмінацыя яго знаходзіцца ў другой страфе сярэдняй часткі, ў харальным і гамафонна-падгалосачным складзе на словах:

«Плачуць тапалі, бярозы
І нават малады дубок,
Быцам раняе слёзы
Кожны яго лісток. »

У песенным жанры на партызанскую тэму пісалі і кампазітары сярэдняга пакалення ў 70-ыя–80-ыя гады: П. Альхімовіч «Партызанскі гармонік», Э. Зарыцкі «Партызанская бярозка» (сл. А. Вольскага), «Лясныя салдаты» (сл. Г. Бураўкіна), І. Кузняцоў « Партызанскі край». Самай значнай па вырашэнню пачуццяў ад перажытага мінулага з'яўляецца песня І. Лучанка «Памяць сэрца» (сл. М. Ясеня). У вакальна-сімфанічным жанры даніна гераізму партызан ярка выразілася ў знакамітай кантаце А.Багатырова «Беларускім партызанам»(сл. Я. Купалы), напісанная яшчэ ў 1942 годзе. Музычным помнікам герою партызанскага руху на Беларусі, камандзіру першай беларускай партызанскай брыгады. Бацьку Мінаю, прысвечана кантата П. Падкавырава «Балада аб чатырох заложніках» ( на тэкст аднаіменнай паэтычнай баллады А. Куляшова). Драматургія твора заснавана на супрацьстаянні двух кантрастуючых вобразных сфер: глыбокі чалавечнасці (жаночы хор) і жорсткасці, свету і цемры(мужчынскі хор). Цэнтральным эпізодам кантаты з'яўляецца «Калыханкі – вобраз трохгадовага сына Мiная.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Героям партызанам прысвечаны кантаты: «Памяці Канстанціна Заслонава» Ул. Алоўнікава, «Памяці Марата Казея» Ю. Семенякі, «Лаўскі бой» Л. Свердзеля, «На могіле партызана» Ул. Будніка. Кульмінацыйімі ў адлюстраванні партызанскай тэмы стала араторыя Ул. Алоўнікава «Партызанскія песні» (1987г.). Праз увесь пяцічастковы твор праходзіцьтэма Радзімы, падчас героікі і барацьбы, вобразы вайны і перамогі. Літаратурнай асновай араторыі паслужылі арыгінальныя тэксты песен беларускіх партызан. У заключэнні пятай часткі гучыць тэма песні кампазітара «Лясная песня. Сярод значных і яркіх твораў на тэму Вялікай Айчыннай вайны называем араторыю А.Багатырова «Бітва за Беларусь» у васьмі частках (тэксты Г. Бураўкіна, Н. Гілевіча, А Куляўова) – з‘яўляецца заключная частка «Над брацкай магілай» (тэкст А. Куляшова) – кульмінацыя араторыі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ:

1. Глушчанка, Г. С., Мухарынская Л. С. – Мінск : Вышэйшая школа, 1971. – Вып. 1. – 544 с.

2. Кулешова, Г. Г. Белорусская кантата и оратория / Г. Г. Кулешова. – Минск : Наука и техника, 1987. – 294 с.

3. Роўда, В. Харавы канцэрт : рэпертуарны зборнік / В. Роўда. – Мінск : Беларусь, 1980. – 46 с.

4. Смагін, А. І. Беларуская харавая літаратура : курс лекцый / А. І. Смагін. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1998. – 187 с.

5. Смагін, А. І. Харавое мастацтва Беларусі ХХ ст. / А. І. Смагін. – Мінск : Беларус. ун-т культуры, 1998. – 191 с.

Алексеева А. И., БГУКИ, студент 215 группы

очной формы обучения

Научный руководитель – Алекснина И. А.,

кандидат искусствоведения, доцент